# ПАГАДНЕННЕ

## паміж Урадам Рэспублікі Казахстан
## Урадам Рэспублікі Беларусь
## аб стварэнні міждзяржаўных гаспадарчых структур

Урад Рэспублікі Казахстан і Урад Рэспублікі Беларусь, якія ў далейшым называюцца "Бакі",

усведамляючы ўзаемазалежнасць нацыянальных прамысловых комплексаў;

зыходзячы з мэтазгоднасці правядзення скаардынаванай структурнай палітыкі;

грунтуючыся на Заяве кіраўнікоў дзяржаў аб урэгуляванні ўзгодненых дзеянняў у правядзенні гандлёва-эканамічнай рэформы, прынятай I4 лютага I992 г. у г. Мінску,

пагадзіліся аб наступным:

### Артыкул I

Бакі будуць утвараць міждзяржаўныя гаспадарчыя структуры розных арганізацыйна-прававых форм і, у першую чаргу, акцыянерныя кампаніі, пабудаваныя на прынцыпах тэхналагічнай звязанасці безадносна да тэрыторый і галін прамысловасці як асновы рацыяналізацыі гаспадарчых сувязей і стабілізацыі работы буйнамаштабнай вытворчасці.

### Артыкул 2

Бакі даручаць адпаведным органам у трохмесячны тэрмін заключыць спецыяльныя пагадненні аб стварэнні канкрэтных міждзяржаўных гаспадарчых структур.

### Артыкул 3

Гэта Пагадненне ўступае ў сілу з моманту яго падпісання.

Учынена ў г. Алма-Аце I6 верасня I992 г. у двух экземплярах, кожны на казахскай, беларускай і рускай мовах, прычым усе тэксты маюць аднолькавую сілу.

| | |
|---|---|
| За Урад<br>Рэспублікі Казахстан | За Урад<br>Рэспублікі Беларусь |